*А.В.Пагоцкая,*
*выкладчык*

# ТЭАТРАЛЬНАЯ АРХІТЭКТУРА 2-Й ПАЛОВЫ XVIII – ПАЧАТКУ XIX СТ. НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Высокі мастацкі ўзровень архітэктуры і мастацтва на тэрыторыі Беларусі часоў позняга барока і ракако быў абумоўлены актыўным асваеннем заходнееўрапейскай культуры. З усёй жанравай разнастайнасці мастацтваў асабліва імклівы пад'ём перажываў тэатр. Ён набываў важную ролю ў культурным жыцці грамадства, бо з'яўляўся адной з шырокіх сфер рэалізацыі асноўнай мастацка-эстэтычнай мэты стылю ракако – сінтэзу мастацтваў. У тэатры ў адзіны ансамбль аб'ядноўваліся літаратура, музыка, жывапіс, садова-паркавае мастацтва. Новаўвядзеннем эпохі ракако сталі аматарскія спектаклі. Як і ў еўрапейскіх арыстакратычных рэзідэнцыях, прэстыжам магнацкага двара на тэрыторыі Беларусі становяцца арганізацыя ўласнай акцёрскай трупы ці аркестра, пабудова тэатральнага будынка. Магнаты бачылі ў тэатры спосаб асабістай рэпрэзентацыі і пацехі.

У Рэчы Паспалітай захаваліся некалькі праектаў тэатральных залаў як магнацкіх, так і грамадскіх, распрацаваных у 2-й палове XVIII ст. У прыватнасці, тэатральныя будынкі і залы праектавалі Д.Мерліні, Я.Х.Камзетцэр, А.Машынскі, С.К.Патоцкі, Я.Кубіцкі і Ш.Б.Цуг. У эпоху Асветы праекты тэатральных будынкаў належалі да ліку найбольш папулярных архітэктурных задач. Сярод захаваных праектаў заслугоўвае асаблівай увагі вырашэнне тэатральнай залы ў палацы канцлера Вялікага княства Літоўскага Аляксандра Сапегі ў Ружанах. Стварэнне тэатральных залаў пры магнацкіх палацах маглі дазволіць сабе толькі вельмі заможныя людзі. У шляхецкіх рэзідэнцыях для гэтага звычайна выкарыстоўваліся бальныя залы. У 1741–1746 гг. такая шматфункцыянальная зала была створана ў каралеўскім замку ў Варшаве.

На тэрыторыі Беларусі ў XVIII – першай палове XIX ст. існавалі прыгонныя тэатры. Часцей за ўсё яны дзейнічалі ў прыватнаўласніцкіх гарадах, замках і сядзібах. Значную ролю ў гісторыі беларускага, польскага і рускага мастацтва адыгралі прыгонныя тэатры Радзівілаў у Нясвіжы, Слуцку, Зорыча ў Шклове, якія мелі тэатральныя будынкі з добра абсталяванай сцэнай і развітой машынерыяй.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Тры месцы Рэчы Паспалітай – Нясвіж, Слуцк і Слонім – адыгралі ў XVIII ст. выдатную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры. У Нясвіжы (храналагічна першым з узніклых прыдворных тэатраў) і Слуцку Радзівілы, у Слоніме гетман Міхал Агінскі ўтрымлівалі вялікія двары, якія не ўступалі заходнім. Нясвіж, размешчаны ў прыгожай даліне, акружанай лясамі, быў як бы прызначаны для стварэння цэнтра музычна-тэатральнай культуры. На гары, акружанай з трох бакоў азёрамі, узвышаліся над ваколіцай вежы замка, у якім існавала тэатральная зала. У летняй рэзідэнцыі Альбе былі яшчэ два сезонныя тэатры: адзін у невялікім драўляным палацы "Кансаляцыя" (суцяшэнне, пацеха), а другі ў "Школе рыцарскай", дзе ігралі французскія і польскія камедыі [3, с. 27]. Некаторыя даследчыкі лічаць, што "Кансаляцыя" была пабудавана не ў Альбе, а каля Нясвіжскага замка, што пацвярджаюць даныя Інвентара 1755 г. Маленькі палац для пацехі будаваўся па праекту Казіміра Ждановіча. Не выпадкова Цэханавецкі называе кансаляцыяй нясвіжскія паркі, далучаныя да замка [2, с. 91]. Ансамбль у Альбе ўключаў некалькі "італьянскіх" паркаў у стылі французскага класіцызму.

На манер "баскетных" тэатраў у Версалі ў рэгулярных парках магнацкіх рэзідэнцый паўсюдна ўзнікаюць "зялёныя" тэатры, якія арганізуюцца непасрэдна на натуральных схілах, на травяністых газонах у акружэнні стрыжаных шпалер. Такія тэатры існавалі ў палацах Браніцкага ў Беластоку, Радзівілаў ў Нясвіжы. Характар арганізацыі "паветранага" тэатра, яго мабільнасць цудоўна адлюстраваныя ў гравюрах М. Жукоўскага. Тэхнічнае афармленне такога тэатра павінна было быць нескладаным, адпавядаць умовам хуткай устаноўкі і ўборкі дэкарацый. У гравюры да нясвіжскай пастаноўкі спектакля "Дасціпнае каханне" паказана пастаянная дэкарацыйная ўстаноўка ў выглядзе прамавугольнай пляцоўкі, якая і з'яўлялася сцэнай, агароджанай лёгкай драўлянай аркадай. Перад ёй быў размешчаны рад крэслаў для публікі. Архітэктурнае афармленне аркады насычана скульптурай, дэкорам. Такія дэкарацыі лёгка і хутка маглі быць сабраны ў любым месцы парка, на любым неабходным ландшафтным фоне. Другі тып тэатра ўяўляў сабой сцэну-пляцоўку, абкружаную роўнымі кулícнымі сценкамі-баскетамі [1, с. 53]. Такая арганізацыя відовішчаў была распаўсюджана ў расійскіх сядзібах Марфіна, Кускова і іншых, а таксама ў Лазенках у Варшаве.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Тэатралізацыі падвяргаліся ўсе мерапрыемствы – паляванні, ваенныя парады, рэлігійныя абрады, рознага роду палацавыя цырыманіялы і нават палітычныя акцыі. Забаўляльны і “іранічны” характар арганізацыі паркавага асяроддзя найбольш ярка праявіўся ў забудове каля Нясвіжа загараднай рэзідэнцыі Радзівілаў, названай Альба. У адпаведнасці з задумай М. К. Радзівіла архітэктурна-паркавы комплекс быў закладзены ў 1758 г. на тэрыторыі больш за 200 га і фарміраваўся пад кіраўніцтвам архітэктара Л.Лютніцкага і пры ўдзеле вядомых італьянскіх дойлідаў К.Спампані і М.Педэцці. Тэрыторыя комплексу атрымала рэгулярную планіроўку. Парк складаўся з трох участкаў – “рэгулярнага”, “пейзажнага” і “італьянскага” [2, с. 384]. Менавіта ракако вызначала гэты ландшафтны кангламерат.

Рэгулярны кулісны парк быў разбіты вакол палаца М.К.Агінскага ў Слоніме. Штучна арганізаванае паркавае асяроддзе павінна было ствараць умовы для забаў, жартаў, пацех. З гэтай мэтай будаваліся зялёныя лабірынты, газоны для гульняў, атракцыёны, фантаны, размяшчаліся тыповыя аксесуары забаўляльнага парка. Дастаткова нагадаць гульнёвыя элементы рускіх паркаў: катальную горку ў Араніенбаўме (зараз Ламаносаў), фантаны-штукаркі ў Петрадварцы, шматлікія зялёныя тэатры, лабірынты.

У нашы дні не засталося нічога на месцы, дзе існаваў у XVIII ст. адзін з буйнейшых і арыгінальных па характары архітэктуры тэатраў на тэрыторыі Беларусі – тэатр у Слоніме. Ён быў прыстасаваны для паказу грандыёзных оперных і балетных спектакляў. Існуе версія, што тэатр у Слоніме адпавядаў тэатру ў каралеўскай палацава-паркавай рэзідэнцыі Лазенкі ў Варшаве, урачыстае адкрыццё апошняга адбылося ў 1791 г. Гэта быў амфітэатр, размешчаны на беразе сажалкі, а сцэна – на востраве, прычым так, каб яна добра была відаць з тэрасы палаца. У якасці ўзору для пабудовы амфітэатра каралеўскі архітэктар Я.Камзетцэр узяў амфітэатр у Геркулануме, а для пастаяннай дэкарацыі сцэны – руіны Баальбека ў Сірыі. Праектуючы амфітэатр, ён карыстаўся адпаведнымі карцінамі, аднак не капіраваў іх, а выкарыстоўваў узоры адвольна.

Дзякуючы арыгінальнаму размяшчэнню сцэны ў яе дэкарацыі ўключаўся навакольны водны пейзаж. Камзетцэр здолеў стварыць высокамастацкі твор. Лазенкаўскі амфітэатр з’яўляецца адным з нешматлікіх збудаванняў такога роду ў свеце. І хутчэй за ўсё

БІБЛІЯТЭКА БДУКіМ

тэатр у Слоніме быў пабудаваны па прыкладу лазенкаўскага амфітэатра.

Спецыяльныя тэхнічныя канструкцыі, такія як фантаны з рэзервуарамі для вады, вельмі складаныя тэхнічныя прыстасаванні для змены дэкарацый, якія былі ў тэатры Слоніма, тэатральныя машыны, створаныя па праектах машыніста сцэны Ж. Бойі, – усё гэта сведчыць аб тым, што тэатр у Слоніме быў узорам дасканала аснашчанага тэатра позняга барока, які меў бліскучае тэхнічнае абсталяванне і памерамі не ўступаў вялікім гарадскім тэатрам, разлічаным на разнастайны сучасны рэпертуар. На сцэне звычайна было шмат людзей, у тэатры выкарыстоўвалася вынаходлівая змена дэкарацый, што давала магчымасць паказваць цэлыя баявыя эпізоды ці вялікія сцэны. У тэхнічных адносінах ён нават перасягаў такія вядомыя тэатры, як, напрыклад, Мангеймскі тэатр.

Адначасова з барочнымі на Беларусі закладваліся паркі ў стылі французскага класіцызму, які атрымаў найбольш яркае адлюстраванне ў мастацтве Андрэ Ленотра. Рысы сістэмы Ленотра знайшлі ўвасабленне ў парках Альбы і Ружан.

Тэатральныя збудаванні ў Ружанах, Гродне, Дзярэчыне, Слоніме, якія дайшлі да нас у малюнках ці ў руінах, з'яўляюцца такімі ж дакументамі тэатральнай гісторыі Беларусі, як і драматычныя творы, рэпертуар тэатраў ці ўспаміны сучаснікаў. Захаваныя адлюстраванні ў спалучэнні з літаратурнымі крыніцамі дазваляюць прасачыць агульную тапаграфію тэатральных помнікаў у асобных гарадах, убачыць, як прыстасоўваліся для тэатральных патрэб тыя ці іншыя будынкі. Параўнанне дайшоўшых да нас звестак у літаратуры, праектных планаў і тэатральных збудаванняў дазваляе сцвярджаць, што асноўным тыпам прыватнаўласніцкіх тэатраў быў тып будынка, кампактны ў плане, з падковападобнай залай, з двух'яруснай сістэмай лож і адносна глыбокай сцэнай, на якой магчыма было размяшчаць перспектыўную кулісную дэкарацыю ад 5 да 7 планаў. Акрамя таго, у асобных выпадках, як гэта было ў Слоніме, тэатральныя будынкі мелі індывідуальны і унікальны характар і былі прыстасаваны да паказу грандыёзных оперных і балетных спектакляў.

1. *Арава* Э. В. Нясвіжскія тэатральныя гравюры // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1972. – № 2. – С. 53 – 55.

2. *Федорук* А.Т. Старинные усадьбы Минского края. – Мн.: Полифакт, 2000. – 416 с.: ил.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

3. *Miller* A. Teatr polski i muzyka na Litwie jako strażnice kultury zachodu (1745 – 1865). – Wilno: Studjum zdziejów kultury polskiej, 1936. – 245 s.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ